**УДК 347.6**

***Н. В. Дзенісенка***

# ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І РЭСПУБЛІКІ КАЗАХСТАН ПА ПЫТАННЯХ СУРАГАТНАГА МАЦЯРЫНСТВА

*У артыкуле аналізуецца заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Казахстан у сферы сурагатнага мацярынства, на падставе чаго ўносяцца прапановы па ўдасканаленні беларускага заканадаўства. У прыватнасці, прапануецца даць легальнае вызначэнне дагавора сурагатнага мацярынства, у якім, апроч іншага, адлюстраваць, што адным з бакоў дагавора з'яўляюцца асобы, якія знаходзяцца ў шлюбе і жадаюць мець дзіця (або генетычная маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе)*

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь востра стаіць дэмаграфічная праблема. Ёсць шмат прычын, якія выклікаюць нізкі ўзровень нараджальнасці насельніцтва, і адна з іх – бясплоднасць. Бясплоднымі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца 14 % шлюбных пар. Хоць гэта і сярэдняя статыстыка па свеце, такая лічба не абнадзейвае [1]. Толькі ў 2019 годзе зарэгістраваны 752 выпадкі бясплоднасці на 100 000 у жанчыны ва ўзросце ад 18 да 49 гадоў [2].

Адным са спосабаў вырашэння названай праблемы на сённяшні дзень з'яўляецца прымяненне метадаў дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, адзін з якіх – сурагатнае мацярынства. Сурагатнае мацярынства дазволена не ва ўсіх дзяржавах, аднак у краінах постсавецкай прасторы – Расійскай Федэрацыі, Украіне, Азербайджане, Арменіі, Кыргызстане, Малдове, Таджыкістане, Казахстане – дадзены метад дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій ужываецца і заканадаўча рэгулюецца.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца параўнальны аналіз заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Казахстан па пытаннях сурагатнага мацярынства для выяўлення магчымасці далейшага ўдасканалення заканадаўчых палажэнняў Рэспублікі Беларусь у гэтай сферы. Варта адзначыць, што заканадаўства Рэспублікі Казахстан па пытаннях прымянення сурагатнага мацярынства з'яўляецца досыць прагрэсіўным. Дадзены метад знаходзіць сваё замацаванне ў Кодэксе Рэспублікі Казахстан ад 7 ліпеня 2020 г. № 360-VI «Аб здароўі народа і сістэме аховы здароўя», а таксама ў Кодэксе Рэспублікі Казахстан ад 26 снежня 2011 года № 518-IV «Аб шлюбе і сям'і» (далей – Кодэкс).

Артыкул 1 Кодэкса ўтрымлівае паняцці дапаможных рэпрадуктыўных метадаў і тэхналогій, сурагатнага мацярынства, сурагатнай маці, дагавора сурагатнага мацярынства. Згодна з названым артыкулам, дагавор сурагатнага мацярынства – гэта натарыяльна засведчанае пісьмовае пагадненне паміж асобамі, якія знаходзяцца ў шлюбе і жадаюць мець дзіця, і жанчынай, якая дала сваю згоду на выношванне і нараджэнне дзіцяці шляхам прымянення дапаможных рэпрадуктыўных метадаў і тэхналогій [3].

У адрозненне ад Кодэкса, Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 студзеня 2012 г. № 341-З «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях» (далей – Закон аб ДРТ) [4], які з'яўляецца асноўным нарматыўным прававым актам, які рэгулюе адносіны ў сферы дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, і ў тым ліку сурагатнага мацярынства, не ўтрымлівае паняцця дагавора сурагатнага мацярынства. У частцы першай артыкула 21 названага Закона толькі сказана, што «дагавор сурагатнага мацярынства заключаецца паміж сурагатнай маці і генетычнай маці або жанчынай, якая выкарыстала донарскую яйцаклетку, у пісьмовай форме і падлягае натарыяльнаму засведчанню. Асобы, якія знаходзяцца ў шлюбе,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

заключаюць дагавор сурагатнага мацярынства з пісьмовай згоды свайго мужа» [4]. Неабходнасць заканадаўчага замацавання вызначэння названага паняцця зазначала Ю. В. Антоненка [5, с. 64]. Варта таксама адзначыць, што па беларускім заканадаўстве бокам дагавора з'яўляецца менавіта генетычная маці або жанчына, якая выкарыстала донарускую яйцаклетку, а ў выпадку, калі яна знаходзіцца ў шлюбе, то дагавор заключаецца з пісьмовай згоды яе мужа. Заканадаўства Казахстана адрозніваецца тым, што бокам выступаюць менавіта муж і жонка, з чаго вынікае, што яны абодва нясуць абавязкі па дагаворы (аплаціць выдаткі, прыняць дзіця).

Зыходзячы з вышэйвыкладзенага, узяўшы за аснову вызначэнне, дадзенае Ю. В. Антоненка, лічым неабходным дапоўніць артыкул 1 Закона аб ДРТ абзацам чацвёртым наступнага зместу:

«Дагавор сурагатнага мацярынства – гэта натарыяльна засведчанае пагадненне паміж асобамі, якія знаходзяцца ў шлюбе і жадаюць мець дзіця (генетычнай маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе), і сурагатнай маці, згодна з якім сурагатная маці, якая дала згоду на імплантацыю эмбрыёна, абавязваецца выносіць, нарадзіць і ў далейшым перадаць дзіця (дзяцей), зачатае (зачатых) з яйцаклеткі, узятай з арганізма генетычнай маці або донарскай яйцаклеткі, па-за арганізмам жанчыны, калі выношванне і нараджэнне дзіцяці генетычнай маці фізіялагічна немагчыма або звязана з рызыкай для жыцця генетычнай маці і (або) дзіцяці, а асобы, якія знаходзяцца ў шлюбе і жадаюць мець дзіця (генетычная маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе), абавязваюцца аплаціць кошт паслугі (у выпадку выплатнага дагавора), а таксама выдаткі на медыцынскае абслугоўванне, харчаванне, пражыванне сурагатнай маці ў перыяд выношвання, родаў і ў пасляродавы перыяд і прыняць ад сурагатнай маці дзіця (дзяцей) ва ўстаноўлены ў дагаворы тэрмін». На наш погляд, дадзенае вызначэнне адлюстроўвае ўсе характэрныя рысы дагавора сурагатнага мацярынства.

Яшчэ адной адметнай асаблівасцю заканадаўства Рэспублікі Казахстан з'яўляецца замацаванне ў артыкуле 57 правоў і абавязкаў бакоў дагавора сурагатнага мацярынства [3]. Такім чынам, у дадзеным артыкуле рэгламентаваны абавязкі не толькі сурагатнай маці, але і заказчыкаў. Артыкулам жа 23 Закона аб ДРТ рэгламентаваны толькі правы і абавязкі сурагатнай маці. У сувязі з гэтым лічым неабходным дапоўніць Закон аб ДРТ артыкулам $23^{1}$ «Правы і абавязкі асоб, якія знаходзяцца ў шлюбе і жадаюць мець дзіця (генетычнай маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе)», у якой усталяваць прыкладны пералік правоў і абавязкаў, якія вынікаюць з вызначэння дагавора сурагатнага мацярынства, дадзенага намі вышэй.

Пунктам 1 артыкула 59 Кодэкса прадугледжана, што бацькамі дзіцяці, якое нарадзілася на падставе дагавора сурагатнага мацярынства, прызнаюцца муж і жонка (заказчыкі). Гэтае палажэнне аналагічнае нормам беларускага заканадаўства, што з'яўляецца станоўчай тэндэнцыяй прававога рэгулявання сурагатнага мацярынства [3]. Аднак у частцы трэцяй пункта 3 вышэйпазначанага артыкула прадугледжана магчымасць адмовы ад дзіцяці заказчыкамі. Пры гэтым права на мацярынства са згоды сурагатнай маці захоўваецца за ёй, а ў выпадку яе адмовы дзіця перадаецца пад апеку дзяржавы [3]. Частка чацвёртая пункта 3 артыкула 59 Кодэкса, у сваю чаргу, утрымлівае гарантыю для сурагатнай маці ў выпадку яе згоды на прыняцце дзіцяці – у такім выпадку заказчыкі абавязаны выплаціць сурагатнай маці кампенсацыю ў памеры і парадку, якія ўстаноўлены дагаворам. Такое палажэнне адсутнічае ў беларускім заканадаўстве, аднак, на наш погляд, увядзенне такой нормы паспрыяла б урэгуляванню адносін паміж заказчыкамі і сурагатнай маці ў выпадку адмовы заказчыкаў ад дзіцяці.

Варта таксама адзначыць, што заканадаўства Рэспублікі Беларусь не ўтрымлівае спецыяльнай агаворкі пра адказнасць за дзіця, якое нарадзілася ў выніку сурагатнага мацярынства, у выпадку скасавання шлюбу заказчыкамі, а таксама ў выпадку смерці мужа або жонкі ці іх абодвух. Пунктам 4 артыкула 59 Кодэкса ўстаноўлена, што ў выпадку скасавання шлюбу заказчыкаў адказнасць за дзіця, якое нарадзілася па дагаворы сурагатнага мацярынства, ускладаецца на абодвух заказчыкаў [3].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пункт 5 артыкула 59 Кодэкса прадугледжвае, што ў выпадку смерці аднаго з заказчыкаў адказнасць за дзіця, якое нарадзілася па дагаворы сурагатнага мацярынства, ускладаецца на таго, хто застаўся ў жывых [3]. Што тычыцца выпадку смерці абодвух заказчыкаў, то тут падыход заканадаўства Казахстана аналагічны падыходу ў сітуацыі з адмовай заказчыкаў ад дзіцяці: у выпадку смерці абодвух заказчыкаў і адмовы іх блізкіх сваякоў усынавіць дзіця па жаданні сурагатнай маці гэтае дзіця можа быць перададзена ёй, а ў выпадку яе адмовы – пад апеку дзяржавы (пункт 6 артыкула 59 Кодэкса) [3].

Зазначаныя палажэнні ўяўляюць сабой гарантыі правоў дзіцяці на выпадак адмовы ад яго заказчыкаў, скасавання імі шлюбу, а таксама смерці аднаго або абодвух заказчыкаў. На наш погляд, гэтыя палажэнні павінны знайсці адлюстраванне ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь.

Наступным немалаважным палажэннем заканадаўства Казахстана з'яўляецца ўстанаўленне адказнасці сурагатнай маці за цяжарнасць, прадугледжаную дагаворам сурагатнага мацярынства, пасля прымянення дапаможных рэпрадуктыўных метадаў і тэхналогій, а таксама аб яе абавязку выключыць магчымасць надыходу натуральнай цяжарнасці (пункт 5 артыкула 57 Кодэкса) [3]. Пункт 8 артыкула 59 Кодэкса, у сваю чаргу, прадугледжвае магчымасць скасавання дагавора сурагатнага мацярынства ў выпадку надыходу натуральнай цяжарнасці ў сурагатнай маці пасля яго заключэння з выплатай ёю усіх выдаткаў, затрачаных заказчыкамі паводле дагавора сурагатнага мацярынства [3].

Неабходнасць указання ў дагаворы тэрміна, на працягу якога сурагатная маці абавязваецца не здзяйсняць дзеянняў, звязаных з зачаццем дзіцяці натуральным шляхам, зазначала С. М. Кунішнікава [6]. На наш погляд, палажэнне аб адказнасці сурагатнай маці за цяжарнасць, прадугледжаную дагаворам сурагатнага мацярынства пасля прымянення дапаможных рэпрадуктыўных метадаў і тэхналогій, аб яе абавязку выключыць магчымасць надыходу натуральнай цяжарнасці, а таксама аб неабходнасці скасавання дагавора сурагатнага мацярынства ў выпадку надыходу натуральнай цяжарнасці сурагатнай маці абгрунтаванае, спрыяе належнай абароне правоў патэнцыяльных бацькоў і адпавядае мэтам сурагатнага мацярынства.

Такім чынам, вопыт прававога рэгулявання сурагатнага мацярынства ў Рэспубліцы Казахстан, на наш погляд, з'яўляецца больш эфектыўным і можа быць улічаны заканадаўцам пры ўдасканаленні беларускага заканадаўства аб сурагатным мацярынстве. У сувязі з гэтым лічым неабходным унесці ў заканадаўства Рэспублікі Беларусь наступныя змены:

– дапоўніць артыкул 1 Закона аб ДРТ абзацам чацвёртым, у якім даць вызначэнне паняцця дагавора сурагатнага мацярынства, якое б, у прыватнасці, адлюстроўвала, што адным з бакоў дагавора з'яўляюцца асобы, якія знаходзяцца ў шлюбе і жадаюць мець дзіця (або генетычная маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе);

– дапоўніць Закон аб ДРТ артыкулам $23^1$ «Правы і абавязкі асоб, якія знаходзяцца ў шлюбе і жадаюць мець дзіця (генетычнай маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе)», у якой усталяваць прыкладны пералік правоў і абавязкаў, якія вынікаюць з вызначэння дагавора сурагатнага мацярынства;

– дапоўніць артыкул 52 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і (далей – КаШС) часткай шостай наступнага зместу: «У выпадку адмовы асоб, якія заключылі дагавор з сурагатнай маці, ад дзіцяці права мацярынства па яе жаданні застаецца за сурагатнай маці, а ў выпадку яе адмовы дзіця перадаецца пад апеку дзяржавы»;

– дапоўніць КаШС палажэннямі аб адказнасці за дзіця, якое нарадзілася ў выніку сурагатнага мацярынства, у выпадку скасавання шлюбу заказчыкамі, а таксама ў выпадку смерці аднаго або абодвух заказчыкаў;

– дапоўніць КаШС палажэннем аб адказнасці сурагатнай маці за цяжарнасць пасля прымянення дапаможных рэпрадуктыўных метадаў і тэхналогій, аб яе абавязку выключыць магчымасць надыходу натуральнай цяжарнасці, а таксама аб неабходнасці скасавання дагавора сурагатнага мацярынства ў такім выпадку.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

## Літаратура


1 Современная медицина позволяет забеременеть женщинам даже с диагнозом «бесплодие». С середины 90-х в Беларуси делают ЭКО [Электронный ресурс] // Белтелерадиокомпания. – Режим доступа : https://www.tvr.by/news/glavnyy-efir/sovremennaya_meditsina_pozvolyaet_zaberemenet_zhenshchinam_dazhe_s_diagnozom_besplodie_s_serediny_90/. – Дата доступу : 25.03.2021.

2 Бесплатно воспользоваться одной попыткой ЭКО сможет каждая гражданка Беларуси с 2021 года [Электронный ресурс] // Новости Гомеля. – Режим доступа : https://www.newsgomel.by/news/zdorove/besplatno-vospolzovatsya-odnoy-popytkoy-eko-smozhet- kazhdaya-grazhdanka-belarusi-s-nachala-2021-goda_53042.html. – Дата доступа : 25.03.2021.

3 Кодекс Республики Казахстан о браке (супружестве) и семье: Кодекс Респ. Казахстан, 26 дек. 2011 г., № 518-IV // ИС ПАРАГРАФ – ЮРИСТ [Электронный ресурс] / ТОО «ИнфоТех&Сервис». – Режим доступа : https://online.zakon.kz/document/?doc_id= 31102748#pos=4;-106. – Дата доступа : 25.03.2021.

4 О вспомогательных репродуктивных технологиях: Закон Респ. Беларусь, 07 янв. 2012 г. № 341-З [Электронный ресурс] // Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – 2021. – Режим доступа : https://etalonline.by/. – Дата доступа : 25.03.2021.

5 Антоненко, Ю. В. Понятие договора суррогатного материнства / Ю. В. Антоненко // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. – Серыя 4, Правазнаўства. – 2015. – № 4. – С. 60–65.

6 Кунишникова, С. Н. Договор суррогатного материнства [Электронный ресурс] / С. Н. Кунишникова // КонсультантПлюс: Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2019.


**УДК 347.965**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ